Кнігі з Татарстана папоўнілі фонды Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Перадача ў дар выданняў аб гісторыі, культуры і мастацтве гэтай краіны адбылася падчас адкрыцця выстаўкі «Кнігі ў культурнай прасторы». Мерапрыемства прайшло ў рамках Дзён культуры Рэспублікі Татарстан у Беларусі. «Наша нацыянальнае адраджэнне адбывалася практычна сінхронна, нашы вялікія паэты тварылі ў адзін і той жа час, — заўважыў генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін і дадаў: — У гады Вялікай Айчыннай вайны многія культурныя і адукацыйныя ўстановы Беларусі былі вывезены ў Казань. І мы ўдзячны татарскаму народу, які прыняў і абагрэў людзей, вымушаных пакінуць сваю радзіму. У партызанскіх атрадах на беларускай зямлі змагаліся сотні ўраджэнцаў Татарстана. Больш за 11 тысяч татар загінулі пры вызваленні Беларусі. Шматвяковыя сувязі, якія пераходзяць з пакалення ў пакаленне, цяжка пераацаніць. Яны для нас вельмі важныя. Традыцыі, павага і дыялогі культур аб'ядноўваюць два нашы народы».